# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ РАМЁСТВЫ ПРЫДЗВІНСКАГА КРАЮ: ТКАЦТВА



**Ткацтва – адзін з самых старадаўніх і распаўсюджаных відаў беларускага народнага мастацтва, якое сваімі каранямі ўваходзіць у глыб стагоддзяў. Фрагменты тканін XI-XII стагоддзяў былі знойдзены пры раскопках у Полацку, у Аршанскім, Пастаўскім, Віцебскім раёнах.**

**Для этнографаў беларускае народнае ткацтва ўяўляе вялікую цікавасць, бо яно звязана з гісторыяй народа і можа служыць каштоўным матэрыялам пры даследванні этнічных працэсаў мінулага, этнакультурных узаемасувязяў беларусаў з іншымі народамі.**

**Па матэрыялах даследванняў вызначаюцца адметныя рысы мясцовага ткацтва на Віцебшчыне. Асаблівасцю ўзорнага ткацтва Паазер'я з'яўляецца лёгкасць арнамен-тальна-кампазіцыйных каларыстычных рашэнняў, перавага ў асартыменце тканін для інтэр'ера і абрадавых рушнікоў.**

**Паазерска-падзвінскае ткацтва з Віцебшчыны і суседніх тэрыторый вылучаецца традыцыйнасцю і высокім мастацкім і рамесным узроўнем. Пры шматлікасці рэгіянальных і лакальных мастацка-стылістычных праяўленняў яно мае ярка выяўленую нацыянальную своеасаблівасць, што робіць яго пазнавальным сярод традыцыйных мастацтваў іншых народаў і дазваляе займаць пачэснае месца ў іх шэрагу.**



Детский сад №12 «Праменьчык»

# *Ткацкія паясы*

**Паясы ў традыцыйнай культуры беларусаў па праву займаюць адно з самых пачэсных месцаў. Без асмыслова аздобленых паясоў цяжка ўявіць традыцыйны народны касцюм. Апісанні старадаўняга народнага побыту, звычаяў і абрадаў беларусаў не абыходзяцца без згадкі паясоў. У спосабах вырабу традыцыйных паясоў самым наглядным чынам прасочваецца паслядоўнасць развіцця тэкстыльных тэхналогій.**

**У якасці кампанента традыцыйнага касцюма пояс выконваў тры асноўныя, у большасці выпадкаў цесна звязаныя паміж сабой, функцыі: утылітарную, дэкаратыўную і знакава-сімвалічную.**





**Найбольш ярка практычнае прызначэнне пояса выступала ў мужчынскім касцюме. Поясам абавязкова падпяразвалася кашуля, якая насілася навыпуск. У сэнсе зручнасці падпяразаная кашуля, безумоўна, выгадна адрозніваецца ад непадпяразанай. Але пояс насіўся не толькі для зручнасці. Лічылася верхам непрыстойнасці выйсці з дома непадпяразаным. Існавала народнае павер'е аб тым, што падпяразаны чалавек мае абарону ад злых духаў.**



Пояс мужчыны насілі і з верхнім адзеннем. Шчыльна прыціснутае поясам адзенне надзейна захоўвала так неабходнае ў халодную пару цяпло. Пояс у мужчынскім касцюме выкарыстоўваўся і для таго, каб мацаваць на ім розныя патрэбныя ў жыццёвым і працоўным ужытку рэчы: шабету з махоркай, крэсіва, ключы. Ідучы на працу, за пояс затыкалі сякеру, рукавіцы.

Ужыванне пояса ў жаночым касцюме таксама было давольна разнастайным. Пояс прышываўся да паяснога адзення, замацоўваючы край спадніцы ці андарака. Свабодныя канцы прышытага пояса выконвалі пры гэтым ролю зашпількі. Калі канцы былі доўгія, то, перш чым завязаць, пояс абкручвалі вакол стану. На вузенькіх, павязаных на таліі паясах жанчыны насілі розныя прадметы, напрыклад, ключы ад скрыні. Гэты звычай быў з даўніх часоў. Таксама жанчыны падвязвалі на поясе розныя ўжыткавыя прадметы і амулеты: скураныя сумачкі-кашалькі, касцяныя грабеньчыкі, ключыкі, лыжачкі, падвескі ў выглядзе каней, металічныя бразготкі.

Детский сад № 112





Дастаткова выразна практычнае прызначэнне пояса ў жаночым касцюме выступала пры карыстанні яго з верхнім адзеннем. Пояс, павязаны паверх світкі ці кажуха, надзейна фіксаваў адзенне на целе жанчыны, дапамагаў захоўваць пэўныя формы касцюма.

Пояс насілі і дзеці. Зусім маленькія, гадоў да двух-трох, маглі хадзіць у адных кашулях. Гэта з усёй нагляднасцю дэманструюць старыя фотаздымкі. Малыя дзеці не заўсёды мелі спецыяльны паясок. Яго ролю магла выконваць любая тасемка (“аборка”) з нітак альбо з тканіны. Дзяўчынкі з чатырох-сямі гадоў пачыналі насіць паясное адзенне. Да яго абавязкова дадаваўся вузенькі чырвоны паясок. Калі дзяўчына дасягала ўзросту нявесты, яна атрымлівала права насіць панёву-плахту, а разам з панёвай – і шырокі пляцёны пояс, такі ж самы як, у сталых жанчын.

Шырокія тканыя і асабліва плеценыя паясы як мужчыны, так і жанчыны маглі не завязваць, а мацаваць пры дапамозе прыёмаў скручвання сустрэчных канцоў з наступным падтыканнем пад раней накладзены слой пояса. Пояс пры такім спосабе павязвання абавязкова ахопліваў стан два разы.

Вузкія паяскі мацавалі да самых розных прадметаў, якія служылі для пераноскі чаго-небудзь: саламяных савенек, каробак, збанкоў. Паясы прышывалі ці прывязвалі да палатняных торбаў. Поясам спавівалі немаўлят. На пояс вешалі ключ ад хаты. На ніцы выраблялі ўзорыстыя лейцы для конскай вупражы.

У некаторых вёсках рамяство вырабу паясоў выкарыстоўвалі пры вытворчасці абутку: ткалі пасачкі для басаножак на драўлянай падэшве.





Сярод традыцыйных абрадаў, у якіх найбольш разнастайна выкарыстоўваліся паясы, было вяселле. Захаваліся сведчанні пра тое, што іншы раз нявеста на розных этапах вяселля раздавала больш за паўтары сотні паясоў.

У вясельным абрадзе пояс выконваў ролю шматзначнага сімвала. Наперш ён сімвалізаваў ідэю аб'яднання, устанаўлення сваяцкіх адносін і трывалых сувязяў. У перадвясельнай абраднасці выразна праяўлялася сімволіка пояса, як шляху дарогі, што вядзе маладых да шлюбу. Перад выездам да вянца маладую з маладым, якія разам з дружынай трымаліся за пояс, абводзілі вакол стала тры разы

На наступных этапах вяселля пояс выступаў у якасці сімвала паяднання, злучэння. Пры вянчанні рукі маладой і маладога звязвалі ручніком і поясам, што адпавядае па здешняму звычаю абмену пярсцёнкамі. У царкве ці касцёле пояс расцілалі па рушніку - “падножніку”, на які станавіліся маладыя.

Калі прыходзілі сваты, дзяўчына сярод іншых падарункаў раздавала прыйшоўшым і паясы. У знак згоды на шлюб трэба было завязаць пояс на бутэльку з жытам, якую папярэдне абкручвалі палатном сваёй работы, пасля – ручніком ці хусткай. Зверху завязваўся пояс.






Асноўная маса паясоў на Беларусі да пачатку XX стагодзя выраблялася ў хатніх умовах для патрэб кожнай асобнай сям'і. Дзяўчынкі пачыналі вучыцца рабіць паясы гадоў з пяці-сямі. Спачатку плялі з рознакаляровых нітак розныя матузкі, шнурочкі, вяровачкі, якія патрабаваліся ў сялянскай гаспадарцы ў вялікай колькасці.

Паступова дзяўчынкі засвойвалі розныя тэкстыльныя тэхнікі, пачынаючы з больш простых: віцця, разнастайных прыёмаў плоскага і аб'ёмнага пляцення – “коскай”, на пальцах, на калодачцы, на вілачцы, у 4, 8, 12, 16 нітак, пляцення вузламі.



Праз некаторы час пераходзілі да тых ці іншых ткацкіх тэхнік, бо не ў кожнай мясцовасці ўсе яны былі падстаўлены: ткацтва на ніце, на бердзечку, на квадратных дошчачках, на круглай дочшачцы, на кроснах. Вучыліся ад старэйшых, паўтаралі ўзоры з гатовых паясоў. Займаліся вырабам паясоў у любую вольную хвіліну, вечарамі, пасучы скаціну, адпачываючы пасля цяжкіх гаспадарчых работ.

Детский сад №112



Амаль у кожным доме ў вёсках Беларусі можна была ўбачыць тканыя паясы. На паяску мог вісець ключ ад хаты, паясок быў прымацаваны да кораба з сасновай дранкі, з якім хадзілі ў лес па грыбы і ягады, прывязаны да “набіркі” – невялікай плеценай ёмістасці ў форме глінянага збаночка для збірання ягад.

Пляценне ў агульным разуменні тэрміна – гэта спалучэнне шляхам перакрыжоўвання пад прамым або касым вугламі розных эластычных матэрыялаў. Адна з палос, папераменна агінаючы зверху і знізу другія палосы, замацоўвае іх у адну суцэльную пляцёнку.

Па тэхніцы адрозніваюцца два віды пляцення: падоўжанае (віццё канатаў, вяровак, шнуроў шляхам скручвання і перавівання) і перакрыжаванае (выраб розных ёмістасцей, сцен жылых і гаспадарчых збудаванняў). Існуе меркаванне, што перакрыжаванае пляценне, напэўна яшчэ з мезаліту, паслужыла развіццю ткацтва, якое з часоў бронзавага веку на Віцебскім Падзвінні пастунова стала самастойным відам рамяства.





Старажытны прыём арнаментацыі верхняга суконнага адзення – мужчынскага і жаночага – расшыванне вітым і плеценым шарсцяным шнуром. Плялі аборы для падвязвання пастолаў і лапцей, розныя завязкі-матузы ў складзе паяснога адзення: жаночага – спадніц і фартухоў, мужчынскага – порткаў. З каляровых нітак выконвалі розныя арнаменты: ромбы, квадраты, зорачкі і інш.

Детский сад №12 «Праменьчык»

# Ткацкія станы

1.



**Найбольш старажытным і прымітыўным з'яўляецца стан без станіі, як яго інакш называюць – “кросны на сохах”. Навоі мацаваліся на падстаўках-“сохах”, слупкі вышынёй 80-85 см, дыяметрам 37-39 см, укапаныя у земляную падлогу развілкай уверх (*мал. 1*).**

2.



***Мал. 2 . Рамны ткацкі стан Полацкага павета Віцебскай губерні.***

## *Полацкія ручнікі*

**Пад гэтай умоўнай назвай аб'яднаны паазерскія браныя ручнікі канца XIX – пачатку XX стагоддзя, узоры якіх захаваліся і дайшлі да нашага часу. Устойлівым паказчыкам этнарэгіянальных асаблівасцей ручнікоў полацкага тыпу з'яўляецца іх кампазіцыя. Канцы ручнікоў аформлены шырокім сеткава-рамбічным бардзюрам (да 30 см у вышыню) бранага арнаменту, маса чырвонага колеру, якая адасоблена ад белай ручніковай палатніны.**

**Для ўсходняй часткі Паазер'я – Сенненскага, Шумілінскага, Бешанковіцкага, Гарадоцкага раёнаў характэрныя браныя ручнікі, у якіх асноўны шырокі бардзюр уверсе фланкіраваны дадатковым вузкім шлячком бранага арнаменту з прасветам фону паміж імі, што злучае чырвоны дэкор з белай палатнінай ручніка. Сустракаюцца ручнікі з двума-трыма вузкімі бардзюрамі.**

**3.**



**4.**



***Мал. 3. Ручнік вясельны, 1840-ыя гг. Лён, бавоўна; бранае двухутачнае ткацтва, 30*300 см, в. Раніна (былая Ілюшына) Віцебскага р-на.***

***Мал. 4. Ручнік. Канец XIX – пач. XX ст. Лён, бавоўна; бранае двухутачнае ткацтва; баваўняныя, плеценыя на раме карункі з махрамі, 32*294 см. Месца паходжання невядома. Знаходзіцца у Віцебскім абласным краязнаўчым музеі.***

## *Віцебскія ручнікі*

**Тып браных ручнікоў са шмат'яруснымі бардзюрнымі кампазіцыямі па канцах, якія вырабляліся ў канцы XIX – пач. XX стагоддзя вылучаецца меланжавай чырвона-чорнай каляровай гамай. Чорны колер перамяжаецца з чырвоным, разбіваючы яго масу, што дасягаецца папераменнымі пракідкамі двух узорных уткоў рознага колеру. Такі прыём набліжае гэты тып браных ручнікоў па стылістыцы да чырвона-чорнай вышыўкі крыжыкам, якая ў гэты перыяд панавала ў народным тэкстылі Віцебшчыны.**

**Адметнасцю ручнікоў з'яўляецца іх раслінная арнаментыка ў выглядзе хвалістых галінак з лісцем і кветкамі, пераважна з ружамі. Крыніцай гэтых узораў былі друкаваныя малюнкі для вышывання. Часам ў ручніках раслінныя бардзюры суседнічаюць з палосамі рамбічна-геаметрычнага бранага арнаменту, што сведчыць аб спалучэнні інавацый з традыцыйнымі прыёмамі старажытнай тэхнікі ткацтва.**

**5.**



**6.**



***Мал. 5. Фрагмент ручніка, 1890-ыя гг. Лён, бавоўна; бранае двухутачнае ткацтва, 37*315 см. Г.п. Янавічы Віцебскага р-на.***

***Мал. 6. Канец ручніка, пач. XX ст. Лён, бавоўна; бранае двухутачнае ткацтва; вышыўка крыжыкам, баваўняныя карункі; кіцыцы, 33*41 см. Месца знаходжання невядома.***

**Ручнікі, аздобленыя па канцах невялікім бардзюрам чырвонага геаметрычнага арнаменту, які выкананы ў тэхніцы бранага ткацтва, былі распаўсюджаны ў канцы XIX– пачатку XX стагоддзя па ўсёй Віцебшчыне. Яны адносяцца да найбольш выразных этнакультурных рыс рэгіёнаў Віцебскага Паазер'я і Прыдзвіння.**

**7.**



**8.**



**9.**



***Мал. 7. Ручнік-набожнік. Лён, бавоўна, 4-х нітавае ткацтва “Арыабы з мандылямі”, бранае двухутачнае ткацтва, вязанне кручком; в. Новыя Валосавічы Лепельскага р-на.***

***Мал. 8. Ручнік. Лён, бранае двухутачнае ткацтва. Канец XIX – пач. XX ст., мястэчка Янавічы Віцебскага павета.***

***Мал. 9. Рушнік (рэпліка аўтэнтычнага артэфакта, выраблenага да 1906 г.) з в. Машканы Сенненскага р-на. Бавоўна, бранае двухутачнае ткацтва.***

## *Традыцыйны касцюм*

**Спецыфіка традыцыйнага касцюма, яго непаўторнае аблічча звычайна складаецца з некалькіх кампанентаў, сярод якіх першасная роля належыць дэкаратыўна-арнаментальнаму комплексу і яго састаўным часткам – матэрыялу для арнаментацыі, тэхнічным прыёмам, самому арнаменту, кампазіцыйнаму размяшчэнню, каларыту і іншым паказчыкам.**

**Асноўным матэрыялам для традыцыйнага адзення было даматканае палатно, аднак выкарыстоўванне фабрычных тканін і ступень забяспечанасці імі знаходзіліся ў прамой залежнасці ад матэрыяльнага стану сялянскай сям'і. Даматканыя тканіны, выробленыя беларускімі сялянкамі, сведчылі пра добры гусце і высокае майстэрства. Характарызуючы адзенне насельніцтва Віцебшчыны бачна, што на святочным адзенні была тканіна, вытворчасць і апрацоўка якой можа паспрачацца з крамнай.**

**Асабліва ўвага надавалася тканінам, якія прызначаліся для вырабаў рукавоў жаночых кашуль. Яны адрозніваліся багатым упрыгожваннем. Аднак для Паазер'я багатае "затыканне" рукавоў не было характэрным.**

**Тканіна тут выраблялася з трымачатырма палосамі без арнаменту, якія знаходзіліся ў верхняй частцы рукава. Былі і такія кашулі, рукавы якіх не ўпрыгожваліся зусім. Гэта тлумачыцца тым, што тут да канца XIX – пач. XX стагоддзя жаночая кашуля была тунікападобнага пакрою і раней чым у іншых раёнах выкарыстоўвалася як сподняя.**



Детский сад №112 «Праменьчык»



**Абавязковая прысутнасць дэкору на рукавах як жаночых, так і мужчынскіх кашуль мела ў мінулым значэнне абярэгу і адначасова павінна была садзейнічаць павышэнню працаздольнасці рукі. Лакалізацыя арнаменту на каўняры, падоле, нагрудным разрэзе, швах, уздоўж швоў тлумачыцца даследчыкамі як своеасаблівая сістэма ахоўных знакаў, неабходных у тых месцах, якія ўяўляліся найбольш небяспечнымі для пранікнення духаў зла.**



## *Дываны, посцілкі*

**У Сафійскім саборы ў Полацку яшчэ у другой палове XX стагоддзя захоўваўся вялікі дыван старажытнай работы мясцовых майстроў. Фон дывана складаўся з кветак, а цэнтр меў выгляд крыжа, унутры якога былі размешчаны выявы фантастычных звяроў. Завяршаў кампазіцыю шырокі бардзюр.**

**10.**  **11.**  **12.** 

***Мал. 10. Палатно, неадбельны лён, двунітавае ткатцва на гарызантальным ткацкім станку (хатніх "кроснах"), в. Стары Лепель Лепельскага раёна.***

***Мал. 11. Фрагмент шырокай посцілкі (150 см) з баваўнянай асновай і шэрсцяным утком, выраблена на вузкіх кроснах, на вонкавым баку добра бачны тэхналагічны перагіб, 1801 г., в. Лужкі Шаркаўшчынскага раёна.***

***Мал. 12. Фрагмент посцілкі-кілімы з рознакаляровымі папярэчнымі рэпсавымі палоскамі, мела лакальную назву "паласавік", "пасяк".***

**У другой палове XIX стагоддзя ткацтвам як промыслам займаліся не толькі жанчыны, але і мужчыны, хоць перавага была на баку жанчын.**

**Ручнікі вызначаліся высокай мастацкай дасканаласцю і таму ахвотна набываліся жыхарамі павета і прыезджымі.**

**Поўнанатуральны характар большасці сялянскіх гаспадарак праяўляўся ў шырокім ужыванні саматканага палатна. Ільняное палатно і сукно выраблялі ў вёсках. Саматканае сукно, аднатоннае і ўзорнае, а таксама паўсукно ішлі на спадніцы-андаракі, штаны, верхняе адзенне. Пры гэтым майстры кіраваліся спрадвечнымі канонамі і ўвесь час удасканальвалі іх. На Віцебшчыне выраблялі падвойныя тканіны палатнянага ці рэпсавага перапляцення. Асаблівасць іх у тым, што ткаліся яны шырокімі, "падвойнымі" (150 см) на звычайным вузкім станку.**

**Пазней шырокія тканіны сталі вырабляць на спецыяльных шырокіх станах, аднак стары спосаб выкарыстоўваўся да сярэдзіны XX стагоддзя, у асноўным для вырабу посцілак.**

**13.**



**14.**



***Мал. 13. Шырокі ткацкі станок з Шаркаўшчыны. Выраб кіліма ў тэхніцы закладнога ткацтва з пругамі на дошчачках.***

***Мал. 14. Навіванне асновы на спецыяльныя вузкія кросенцы для ткацтва ручнікоў (станок выраблены па аўтарскай распрацоўцы). Лепельскі дом рамёстваў.***

**Першую школу ткацтва ў Беларусі заснавала Ганна Маоль пры сваёй майстэрні ў г. Рэжыцы Віцебскай губерні ў другой палове XX ст. (цяпер Латвія – Латгалія). Мастацкія вырабы гэтай майстэрні вызначаліся высокай якасцю, нават не саступалі англійскім тканінам. Тэхніка была новая, прывезеная з Заходняй Еўропы, дасканалая па тых часах. Ткачыхі пасля заканчэння курса вучобы ў майстэрні працягвалі працаваць тут або ў іншых ткацкіх майстэрнях. Школы-майстэрні такога тыпу былі адкрыты ў Дзісне і мястэчку Барок Дзвінскага павета Віцебскай губерні.**

**У майстэрнях ткалі не толькі сукно, але і коўдры, дываны, пледы, хусткі, драпы, шавіёты. Вырабы беларускіх саматужнікаў экспанаваліся ў 1867 годзе на Сусветнай выставе ў Парыжы. Шмат выстаў было арганізавана ў асобных гарадах Беларусі ў 1901-1914 гадах. Разам з іншымі прадметамі народнага мастацтва дэманстраваліся кілімы, коўдры, посцілкі, вытканыя ў народных беларускіх традыцыях, а таксама пад уплывам фабрычных узораў.**

К канцу XIX – пачатку XX стагоддзя хатняе ткацтва на кроснах, прайшоўшы доўгі шлях развіцця, дасягнула свайго найвышэйшага росквіту, аб чым дасканала сведчыць традыцыйны тканы тэкстыль гэтага перыяду. Побач з ткацтвам, неабходным для вырабу адзення, шырока выраблялiся мастацкія ўзорныя тканіны – ручнікі, абрусы, посцілкі і інш.

15.



*Мал. 15. Шматнітовыя льняныя тканіны – “дымкі”.*

16.



*Мал. 16. Фрагмент посцілкі-перабранкі, бавоўна, неадбелены лён.*

17.



*Мал. 17. Фрагмент посцілкі з узорам “Вясёлка”, бавоўна, шэрсць.*

18.



*Мал. 18. Фрагмент посцілкі-перабранкі, бавоўна, паўшэрсць.*

Значнае месца належала дыванам. Дываны разам з узорнымі посцілкамі выраблялiся для ўпрыгожвання сялянскай хаты. Бранае ткацтва – гэта старажытны спосаб узорнага ткання, які атрымаў значнае развіццё ва ўсіх групах усходнеславянскіх народаў, а таксама ў палякаў, літоўцаў, латышоў, эстонцаў, карэлаў, народаў комі, удмуртаў і інш. Бранае ткацтва, як і вырабнае, ажурнае, некаторыя віды перабору магчыма вырабіць толькі пры выкарыстанні рамізак з ніцянымі галёвамі (“нітамі”, “кабылкамі”).

Детский сад №112 «Праменьчык»

**Браны арнамент на тканіне атрымліваюць пры дапамозе дошчачкі-бральніцы, на якую паслядоўна набіраюць групамі ніткі-асновы адпаведна ўзору.**

**Ромб – адзін з самых распаўсюджаных матываў двухутачных браных тканін. Матыў крыжа часам спадарожнічае ромбу. Часцей за ўсё ён сустракаецца на ручніках-набожніках. Большай разнастайнасцю адрозніваюцца матывы: кветачкі, зорачкі, разеткі. Найбольш тыповым з'яўляецца варыянт упісанай у ромб васьміпялёсткавай кветачкі. Асаблівую папулярнасць гэты матыў атрымаў і на тэрыторыі нашага Паазер'я, ён шырока выкарыстоўваўся ў аздабленні абрадавых ручнікоў.**

**19.**



***Мал. 19. Вязанне нітоў- "кабылак" на прыстасаванні, выраблены́м па аўтэнтычным ўзоры пач. XX ст. з Лепельшчыны.***

**20.**



***Мал. 20. Тэхналагічны этап вырабу ручніка – набор радка бранага арнаменту з дапамогай дошчачкі-бральніцы, "запіс" узора "на матузах".***